13. Личный архив проф. А. П. Пьянкова. В 2019 г. он был подарен его внуком Денисом Игоревичем Пьянковым истфаку БГУ.
14. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 737. Л. 103, 104.
15. Против исторической концепции М. Н. Покровского: сборник статей / редкол.: акад. Б. Греков и др. М.-Л.: Изд-во Акад. наук СССР. Ч. 1, 1939. 517 с.; Ч. 2, 1940. 505 с.
16. URL: hst.ru/projects/sohist/repress/don/1937/anatoliev.htm – Дата обращения: 18.09.2023.

УДК 94(476)|650|

# УЗНІКНЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ШКОЛЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ НОВАГА І НАВЕЙШАГА ЧАСУ НА ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ БДУ

**В. С. Макарэвіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, MakareVS@bsu.by*

У артыкуле разглядаецца развіццё напрамку даследаванняў па сацыяльнай гісторыі Беларусі ў БДУ, узнікненне, станаўленне і развіццё школы сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту.

***Ключавыя словы:*** сацыяльная гісторыя; гісторыя БДУ; школа сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу; кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу; А. Г. Каханоўскі.

# ВОЗНИКНОВЕНИЕ И РАЗВИТИЕ ШКОЛЫ СОЦИАЛЬНОЙ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ НОВОГО И НОВЕЙШЕГО ВРЕМЕНИ НА ИСТОРИЧЕСКОМ ФАКУЛЬТЕТЕ БГУ

**В. С. Макаревич**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, MakareVS@bsu.by*

В статье рассматривается развитие направления исследований по социальной истории Беларуси в БГУ, возникновение, становление и развитие школы социальной истории Беларуси Нового и Новейшего времени на историческом факультете Белорусского государственного университета.

***Ключевые слова:*** социальная история; история БГУ; школа социальной истории Беларуси Нового и Новейшего времени; кафедра истории Беларуси нового и новейшего времени; А. Г. Кохановский.

# EMERGENCE AND DEVELOPMENT OF THE SCHOOL OF SOCIAL HISTORY OF BELARUS OF NEW AND MODERN TIMES AT THE FACULTY OF HISTORY OF BSU

**B. S. Makarevich**

*Belarusian State University, 4 Nezalezhnasti Ave., 220030, Minsk, MakareVS@bsu.by.*

The article deals with the development of the direction of research on the social history of Belarus at BSU, the emergence, formation and development of the school of social history of Belarus of the New and Modern Times at the History Department of the Belarusian State University.

***Keywords:*** social history; BSU history; school of social history of Belarus of the New and Modern Times; chair of the history of Belarus of the New and Modern Times; A. G. Kakhanouski.

Адным з найбольш ужываных паняццяў у сусветнай гістарычнай навуцы другой паловы XX ст. стала паняцце «сацыяльная гісторыя». Развіццё гэтага накірунку даследаванняў, а дакладней парадыгмы даследаванняў, як асобнага шляху гістарычнай навуковай думкі, новага канцэптуальнага падыходку у даследаваннях, пачынаецца яшчэ раней – з другой паловы XIX ст. Узнікненне новага напрамку было звязана з агульнымі зменамі, якія адбываліся ў еўрапейскай навуцы таго часу: агульным антрапалагічным паваротам у філасофіі, зараджэннем і развіццём сацыялогіі і псіхалогіі як асобных навук, паглыбленнем міждысцыплінарных сувязяў. Усё гэта накладала свой адбітак на навуковую гуманістыку. У той, ужо даволі адлеглы ад нас перыяд, стала відавочна, што без вывучэння сацыяльных структур, класаў, працэсаў міграцыі і ўрбанізацыі, індустрыялізацыі, немагчыма даць адказ на многія пытанні, ў тым ліку і на пытанні дамінуючай яшчэ ў той час у навуковым дыскурсе палітычнай гісторыі. Цэнтр увагі даследчыкаў пастунова пачынае перамяшчаецца з палітычных пытанняў да вывучэння розных бакоў жыцця і сацыяльнага быту канкрэтных катэгорый насельніцтва, саслоўяў, класаў і г. д. Менавіта яны становяцца галоўнымі аб’ектамі даследаванняў. Усё гэта адбываецца на фоне фарміравання сучасных нацый у Еўропе, фарміравання грамадзянскіх супольнасцяў.

У асобны і самастойны, а пазней нават інстытуцыялізаваны напрамак, са сваімі даследчымі цэнтрамі і кафедрамі, сацыяльная гісторыя выдзяляецца з 1930-х гг. З 60-х гг. XX стагоддзя адным з асноўных паняццяў парадыгмы сацыяльнай гісторыі становіцца паняцце «сацыяльная структура». На вывучэнне сацыяльных структур, пад якімі часта разумеюць класы, саслоўі, страты грамадства і інш., гісторыкі ўсё больш скіроўваюць сваю увагу. Пры гэтым сацыяльная гісторыя сёння ўключае у сябе таксама і гістарычную дэмаграфію і даследаванне гендэрнай гісторыі і ўрбаністыку.

Яна стала і застаецца, калі можна так сказаць, мэйнстрымам у гістарычных даследаваннях, які дае новыя магчымасці для пазнання мінулага, змяняе стаўленне даследчыкаў да праблем і аб'ектаў даследавання, дазваляе ўбачыць і зразумець глыбінныя сацыяльныя змены ў грамадстве, якія як аснова вызначаюць палітычныя і эканамічныя трансфармацыі. Можна казаць таксама пра тое, што сацыяльная гісторыя – гэта напрамак даследванняў, дзе даследчык імкнецца выявіць сацыяльныя перадумовы гістарычных працэсаў ва ўсёй іх складанай сістэме ўзаемазалежнасцяў і ўзаемаабумоўленасцяў.

Разам з тым, паняцце «сацыяльная гісторыя» мае даволі расплыўчатае вызначэнне. Калі казаць абагулена, гісторыкі, якія займаюцца вывучэннем сацыяльнай гісторыі, вывучаюць гісторыю «сацыяльнага» у гістарычнай рэтраспектыве. У пэўнай ступені, са значнымі дапушчэннямі, сацыяльная гісторыя як накірунак, стыкуецца з гістарычнай сацыялогіяй – накірункам у сацыялогіі скіраваным на даследаванне мінулага інструментарыем сацыёлагаў. Пры гэтым два накірункі вувучэння «сацыяльнага» у мінулым, захоўваюць характэрную для сябе метадалогію. Наяўнасць метадалагічных падыходаў двух навук, аднак, ва ўмовах узмацняючыхся інтэрдысцыплінарных сувязяў, ужо не з'яўляецца перашкодай для паспяховай навуковай дзейнасці. З іншага боку, прымяненне падыходаў сацыялогіі да даследаванняў, дзе дапускаецца тэарэтызаванне над мінулым, нярэдка выклікае крытыку з боку гісторыкаў. Гісторыкі традыцыйна ў першую чаргу абапіраюцца на гістарычныя факты, а не на пабудаваныя у адарванасці ад факту тэарэтычныя разважанні.

Заснавальнікам навуковай школы сацыяльнай гісторыі Беларусі яшчэ ў міжваенны час мог бы стаць выдатны беларускі гісторык Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі. Яго работа «История Белоруссии», падрыхтаваная якраз у перыяд яго працы ў БДУ, з'яўлялася пэўным сінтэзам вывучэння пытанняў сацыяльнай і палітычнай гісторыі. У рукапісе работы, сярод іншых, былі раздзелы «Сацыяльны лад», «Народное хозяйство и роль в нём крестьянства», «Очерк народного хозяйства последнего десятилетия», «Рэвалючыйны і рабочы рух». На вялікі жаль, у сувязі з абвінавачваннямі ў нацыянал-дэмакратызме, вучоны ў 1926 г. вымушаны быў пакінуць Беларусь, а рукапіс выдатнага, як на свой час, даследавання быў аддадзены з архіўнага сховішча ў друк толькі ў 2003 г. [5].

Пасля М. В. Доўнар-Запольскага ў даваеннай беларускай савецкай гістарыяграфіі праблематыцы сацыяльнай гісторыі не надавалася значная ўвага. Толькі з 1950-х гг. пачынаюць праводзіцца даследаванні натуральнага руху насельніцтва ў Беларусі, прычым цікавіліся гэтай праблемай пераважна эканамісты і сацыёлагі, у прыватнасці Андрэй Андрэевіч Ракаў.

Марксісцка-ленінская метадалогія панавала цалкам, што не пакідала шанцаў на паяўленне ў сценах дзяржаўных навуковых устаноў работ, якія б не ўпісваліся ў яе строгія рамкі. У блізкім напрамку да сацыяльнай гісторыі магло б развівацца вывучэнне рабочага руху і рабочага класу, часткова сялянства, але і гэтыя работы павінны былі быць строга ўбудаваны ў вызначаны ідэалагічны шаблон – росту колькасці пралетарыяту і адпаведнага нарастання класавай барацьбы, што фактычна не давала магчымасцяў гісторыкам для самастойнага даследчага пошуку. Нельга аднак, цалкам адмаўляць у навуковай вартасці работам гісторыкаў таго перыяду, хаця б па прычыне выяўлення і апрацоўкі імі значнага пласта гістарычных крыніц.

Толькі ў 1960–80-я гг. можна убачыць цікавасць асобных даследчыкаў у сценах універсітэта да аспектаў сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XXI ст. Сюды можна аднесці работы загадчыка кафедры гісторыі БССР Валянціны Уладзіміраўны Чапко: «Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в.» Минск, (1966) [21], «Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века» (1972) [20], «Города Белоруссии в первой половине XIX века : экономическое развитие» (1981) [19]. Але і гэтыя работы па вядомых прычынах не маглі выйсці за ўстаноўленыя ідэалагічныя межы.

Непасрэдна вывучэнне пытанняў сацыяльнай гісторыі Беларусі на гістарычным факультэце БДУ выдзяляецца ў адзін з асноўных напрамкаў правядзення гістарычных даследаванняў толькі з канца 1980-х гг. Адкрыліся новыя далягляды для творчасці прадстаўнікоў гуманітарных і грамадскіх навук, адкрываліся новыя даследчыя гарызонты для выбару як тэматыкі даследаванняў, так і новых тэарэтычных падыходаў і метадаў даследавання.

Кафедра гісторыі Беларусі (у савецкі перыяд кафедра гісторыі БССР існавала з 1958 г., першым яе загадчыкам быў Лаўрэнці Сямёнавіч Абецэдарскі), адна з першых пачала паглыблена распрацоўваць пытанні звязаныя з гісторыяй сацыяльных структур і сацыяльных груп насельніцтва Беларусі, прымяняючы новыя метады даследавання. У гэтым напрамку сталі працаваць тады яшчэ маладыя даследчыкі кафедры А. Г. Каханоўскі (кандыдацкая дысертацыя Сацыяльна-класавая структура насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст. (дыс. 1989.) [8] і П. А. Лойка (Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII стст. 1991.) [10].

Паказальна, што ў 1994 г. у сувязі з пашырэннем і паглыбленнем вывучэння курса айчыннай гісторыі ў БДУ, кафедра гісторыі Беларусі была падзелена на дзве: кафедру гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, якую да 2006 г. узначальваў доктар гістарычных навук П. А. Лойка і

кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, якую да 1999 г. ўзначальваў прафесар П. І. Брыгадзін. У выніку істотна павялічыўся колькасны склад супрацоўнікаў кафедр, значна пашыралася праблемнае поле даследаванняў, у тым ліку і за кошт праблематыкі сацыяльнай гісторыі Беларусі.

З 1999 г., калі кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ўзначаліў тады яшчэ кандыдат навук, а на цяперашні час ужо прафесар і доктар навук А. Г. Каханоўскі, яе склад пачынае папаўняцца цэлай плеядай маладых даследчыкаў, якія ўсклалі на сябе абавязак даследавання новых недаследаваных гарызонтаў беларускай мінуўшчыны. У выніку, у першую чаргу намаганнямі А. Г. Каханоўскага, за апошнія ўжо больш чым два дзесяцігоддзі на кафедры сфарміраваўся і працягвае равівацца навуковы накірунак, які пераўтварыўся ў адмысловую школу сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу пад кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага. Пры гэтым на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу па-ранейшаму працягнулі развівацца і іншыя напрамкі – станаўленне беларускай дзяржаўнасці, гісторыя палітычных партый, грамадскіх арганізацый і рухаў, канфесійная гісторыя Беларусі XIX–XXI стст., ваенна-палітычныя працэсы ў Беларусі і гісторыя Вялікай Айчыннай вайны.

Пад навуковым кіраўніцтвам ці кансультаваннем прафесара А. Г. Каханоўскага былі падрыхтаваны некалькі важных для беларускай гістарычнай навукі работ па сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст., выдадзена некалькі манаграфій і больш за дзясятак калектыўных манаграфій, было рэалізавана некалькі навукова-даследчых тэм. Сярод абароненых пад кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага работ можна адзначыць работы А. Л. Дашкевіча «Маладзёжны рух Беларусі 30 – пачатку 60-х гадоў XIX ст.» (2003) [4], В. С. Макарэвіча «Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча» (2008) [11], Г. І. Маскевіч «Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.» (2012) [13], А. В. Бурачонка «Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.)» (2013) [2].

У 2013 г. свет убачыла манаграфія прафесара А. Г. Каханоўскага «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)», выданне якой стала значнай навуковай падзеяй [7]. На аснове комплекса гістарычных крыніц аўтарам былі даследаваны накірункі і змест трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве у другой палове XIX – пачатку XX ст. У даследаванні была нададзена значная ўвага характарыстыцы эвалюцыі саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі насельніцтва, працэсам сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці розных груп насельніцтва Беларусі, станаўленню класаў буржуазнага грамадства, а таксама некаторым іншым пытанням сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст.

У 2015 г. у капілку кандыдацкіх дысертацый, якія былі падрыхтаваны пад кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага, лягла работа Артура Андрэевіча Кухарэнкі «Дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка на тэрыторыі Беларусі», у 2017 г. яшчэ дзве: Д. П. Брыгадзіна «Преступность в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.» (2017) [1] і А. І. Стралені «Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.)» (2017) [18]. У 2018 г. у рамках работы, якая вядзецца па вывучэнні сацыяльных структур, была падрыхтавана манаграфія аўтара гэтага артыкула «Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.)». У манаграфіі на фоне рэалізацыі ўладамі Расійскай імперыі палітыкі разбору шляхты, разглядаецца працэс эвалюцыі прававога і сацыяльнага статусу катэгорый дробнай шляхты, трансфармацыі саслоўных і сацыяльных структур звязаных з гэтай, не такой ужо і малой, часткай беларускага грамадства, даследуецца рэакцыя шляхты Беларусі на палітыку разбора шляхты [12].

У 2020 г. ўбачыла свет работа яшчэ аднаго прадстаўніка школы, які паспяхова абараніў у выніку і доктарскую дысертацыю пад навуковай апекай Аляксандра Генадзьевіча Каханоўскага, работа Надзеі Сяргееўны Маторавай «Сацыяльная палітыка Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі (1861–1914)» [15]. Аўтар зрабіў вялізны ўклад у вывучэнне маладаследаванай тэмы сацыяльнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі ў паслярэформены перыяд. У 2021 г. даследчык абараніў доктарскую дысертацыю.

Сёння на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX–XX ст. у значнай ступені ўваходзяць у сферу навуковых даследаванняў большасці яе супрацоўнікаў. Сацыяльная гісторыя Беларусі як асобная дысцыпліна стала часткай вучэбных планаў падрыхтоўкі спецыялістаў на гістарычным факультэце. Узніклі такія дысцыпліны як «Сацыяльная гісторыя Беларусі», «Грамадства і ўлада», «Гісторыя прадпрымальніцтва», «Гісторыя моды», «Гістрычная дэмаграфія» і інш. На дадзены момант удзельнікі школы працуюць над падрыхтоўкай падручніка па дысцыпліне «Сацыяльная гісторыя Беларусі», актыўна ўдзельнічаюць ў падрыхтоўцы акадэмічных навуковых выданняў разам са спецыялістамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі [15].

Тэматыка дысертацыйных работ і артыкулаў многіх дактарантаў і аспірантаў кафедры таксама кладзецца ў агульную канву вывучэння сацыяльных аспектаў гісторыі Беларусі ў рамках склаўшайся на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу школы сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу. У 2020 г. Святлана Алегаўна Сідарава скончыла работу над падрыхтоўкай дысертацыі «Развіццё паштова-тэлеграфнай сувязі на тэрыторыі Беларусі (80-е гг. XIX в. – 1914 г.)» і паспяхова яе абараніла [17]. Кандадацкая дысертацыя прысвечаная даследаванню са-

цыяльнага становішча рабочых Беларусі пачатку XX ст. была падрыхтавана аспірантам кафедры Я. В. Маслоўскім [14], ў 2020 г. Кароль М. М. абараніла кандыдацкую дасертацыю па праблеме міжканфесійных пераходаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [6], іншымі аспірантамі, суіскальнікамі і дактарантамі кафедры: І. Лебедзевай [9], Т. Шчэрбай [22], Т. Вароніч [3] і іншымі маладымі даследчыкамі актыўна вядзецца навуковая работа па распрацоўцы пытанняў сацыяльнай гісторыі Беларусі. За апошнія гады выдадзена некалькі дзясяткаў навуковых артыкулаў, прысвечаных разнастайным аспектам сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу. Навуковыя даследаванні школы па-ранейшаму накіраваны на вывучэнне трансфармацыйных працэсаў і сацыяльных змяненняў у беларускім грамадстве ў канцы XVIII–XX стст.: эвалюцыі саслоўна-карпаратыўнай структуры насельніцтва, дэмаграфічных працэсаў, тэрытарыяльнай і сацыяльнай мабільнасці насельніцтва ў канцы XVIII–XX стст., што адпавядае прыярытэтным напрамкам навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь: сацыягуманітарная, эканамічная і інфармацыйная бяспека (чалавек, грамадства і дзяржава, гісторыя, культура, адукацыя, турызм, кіраванне сацыяльнымі працэсамі).

## Бібліяграфічны спіс


1. *Бригадин, Д. П.* Преступность в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.: Дисс. на соиск. учён. степ. канд. ист. наук: 07.00.02. – Минск, 2017.

2. *Бурачонак, А. В.* Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914): Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2012.

3. *Вороніч, Т. В.* Административно-полицейское регулирование проституции в городах Беларуси: вторая половина XIX – начало XX в. // Журнал Белорусского государственного университета / учредитель Белорусский государственный университет. – 2019. – № 1. – С. 46–56.

4. *Дашкевіч, А. Л.* Маладзежны рух Беларусі 30 – пачатку 60-х гг. XIX ст.: Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2003.

5. *Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии. Минск, 2003.

6. *Кароль, М. М.* Перавод каталіцкага насельніцтва Беларусі ў праваслаўе (1863–1914).: аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук: 07.00.02 / М. М. Кароль; Беларускі дзярж. ун-т. Мінск, 2021.

7. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2013.

8. *Кохановский, А. Г.* Социально-классовая структура народонаселения Белоруссии во второй половине XIX в.: Автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 1989.

9. *Лебедзева, І. В.* Дзеці ў сацыяльна-эканамічных працэсах на тэрыторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.: гістарыяграфія пытання // История и историография: объективная реальность и научная интерпретация : сб. науч. ст. по материалам междунар. науч. конф., посвящ. 140-летию со дня рождения акад. В. И. Пичеты / редкол.: А. Д. Король (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – С. 276–283.

10. *Лойка, П. А.* Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII стст. Мінск, 1991.

11. *Макарэвіч, В. С.* Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча: Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. Мінск, 2008.
12. *Макарэвіч, В. С.* Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.) / В. С. Макарэвіч. – Мінск: БДУ, 2018.
13. *Маскевіч, Г. І.* Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.: Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2011.
14. *Маслоўскі, Я. В.* Рабочыя фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў Беларусі (1907–1914 гг.): склад, матэрыяльнае становішча, формы сацыяльнага пратэсту : аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук : 07.00.02 / Маслоўскі Яўген Валер'евіч ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2001.
15. *Моторова, Н. С.* Социальная политика Российской империи на территории Беларуси (1861–1914) : монография / Н. С. Моторова. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2019.
16. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.] Мінск, 2020.
17. *Сидорова, С. О.* Развитие почтово-телеграфной связи на территории Беларуси (80-е гг. XIX в. – 1914 г.) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук / Сидорова Светлана Олеговна; Белорусский государственный университет. – Минск, 2021.
18. *Страленя, А. А.* Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.): Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2017.
19. *Чепко, В. В.* Города Белоруссии в первой половине XIX века : экономическое развитие. Минск, 1981.
20. *Чепко, В. В.* Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века. Минск, 1972.
21. *Чепко, В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Минск, 1966.
22. *Щерба, Т. Н.* Отношение почётных граждан к белорусскому национально-культурному движению в начале XX в. / Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.: матэрыялы міжнар. Навук. канф., Мінск, 29–30 ліст. 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Д. Кароль (старшыня) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2018. – С. 284–286.